# ФІЛАСОФІЯ

УДК 504.03

***М.А. Мажэйка***
*д-р філас. навук, праф., заг. каф. філасофіі і метадалогіі гуманітарных навук*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*
e-mail: marina-mojiko@yandex.by

## СІНДРОМ АНТЭЯ: ЭКАЛАГІЧНАЯ СВЯДОМАСЦЬ БЕЛАРУСАЎ У ПРАСТОРЫ ДЫЯЛОГУ ЗАХОДНЯЙ І ЎСХОДНЯЙ КУЛЬТУР

*Разглядаецца экалагічная свядомасць беларусаў як феномен экалагічнай культуры свету са спецыфічнымі рысамі, што адрозніваюць яго ад экасвядомасці як заходняй, так і ўсходняй традыцый.*

**Уводзіны**

Асноўнай мэтай артыкула з'яўляецца доказ унікальнасці экалагічнай свядомасці беларусаў. Для дасягнення гэтай мэты неабходна вырашэнне наступных задач: выяўленне спецыфікі ўсходняй і заходняй экалагічных традыцый і вызначэнне адрозненняў беларускай экалагічнай свядомасці як ад адной, так і ад другой.

Гаворачы пра ўсходнеславянскую культуру, нярэдка адзначаюць, што яе духоўная прастора выступае месцам сустрэчы традыцый Усходу і Захаду. Але гэтую сустрэчу нельга разглядаць як простае спалучэнне: на самай справе іх узаемадзеянне – гэта складаны крэатыўны працэс, вынікам якога з'яўляецца самабытная свядомасць, у тым ліку экалагічная. Сітуацыя ўзаемнага ўплыву заходніх і ўсходніх версій светаўспрымання, якія прыйшлі да ўзаемадзеяння з прычыны знешніх цывілізацыйных абставін, заўсёды адзначалася высокай крэатыўнасцю, задаючы ў гісторыі культуры новыя тэндэнцыі развіцця. У якасці прыкладаў, якія мадэлююць узаемадзеянне традыцый у маштабе *Захад – Усход*, можна прывесці ўзаемаўплыў антычнай і ўсходняй культур падчас паходаў Аляксандра Македонскага, што абумовіла багацце і разнастайнасць эліністычнай культуры, а таксама ўзаемадзеянне блізкаўсходняга ірацыяналізму (іўдзейскага монатэізму) і заходнееўрапейскай рацыянальнасці (антычнай філасофіі), якое выступіла культурнай глебай фарміравання хрысціянства. У гэтым шэрагу можа быць разгледжана і экалагічная свядомасць у кантэксце беларускай культуры. І тут трэба мець на ўвазе наступныя абставіны.

Па-першае, гаворка ідзе ніяк не пра знешнія формы ўплыву заходняй ці ўсходняй традыцыі на нашу культуру. Гэта значыць не пра ўключэнне ў яе кантэкст тых ці іншых ідэй ды канцэпцый, экзатычных з пункту гледжання яе зместу, што застаюцца маргінальнымі, хаця і аказваюць на яе развіццё адпаведны ўплыў, а, наадварот, аб арганічным змястоўным спалучэнні на аксіялагічных падмурках беларускай экасвядомасці каштоўнасных аспектаў, якія генетычна ўзыходзяць як да заходняй, так і да ўсходняй традыцый, аб глыбокай інтэгральнасці беларускай экалагічнай культуры. Па-другое, гэта ўвогуле не ўспрыманне заходніх ці ўсходніх узораў светапогляду, але іх арганічны сінтэз, які дае арыгінальны вынік. Традыцыі беларускай нацыянальнай культуры, прааналізаваныя з пункту гледжання іх экалагічных арыенціраў, з поўным правам могуць быць ацэнены як экафільныя. Перш за ўсё гэта звязана з тым, што беларуская экакультура ў значнай ступені захоўвае ў сваіх змястоўных падмурках традыцыйныя архетыпы антрапапрыроднай гармоніі, для якіх была характэрна сінтэтычная трактоўка адносін чалавека і прыроды. Істотную ролю ў фарміраванні гэтага экафільнага патэнцыялу адыграла таксама і тое, што экалагічная свядомасць беларусаў з'яўляецца вынікам узаемадзеяння фундаментальных каштоўнасцей, што генетычна ўзыходзяць да заходняй

і ўсходняй традыцый, якія арыентаваны адпаведна на ідэал знешняга прыродапераўтварэнчага актывізму з аднаго боку і ідэал унутранай актыўнасці духоўнага самаўдасканалення з другога.

Менавіта наяўнасць у беларускай экалагічнай культуры традыцыйных каштоўнасцей антрапапрыроднай гармоніі выступае падмуркам крэатыўнасці гэтага ўзаемадзеяння і надае яму перспектыўны напрамак. Чым больш багатай, арыгінальнай і разнастайнай з’яўляецца культура, у духоўнай прасторы якой адбываецца кантакт розных культурных традыцый, тым большую талерантнасць здольна яна прадэманстраваць у сутыкненні з каштоўнасцямі, якія здаюцца несумяшчальнымі. І чым больш самабытныя формы духоўнага жыцця развіваюцца ў межах этнанацыянальнай культуры, тым больш крэатыўным можа з’явіцца крос-культурны дыялог, які разгортваецца ў яе духоўнай прасторы. Базавыя парадыгмы светапогляду Захаду і Усходу, здавалася б, несумяшчальныя ў семантычных і аксіялагічнах адносінах. Пры ўзаемадзеянні ў духоўнай прасторы беларускай экакультуры, якая ад пачатку заснавана на ідэале антрапапрыроднай гармоніі, яны даюць унікальны вынік сінтэзу, фарміруючы спецыфічны тып экалагічнай свядомасці. Гэтая спецыфічнасць выяўляецца ў тым, што ў беларускай экасвядомасці заходняя мадэль прыродакарыстання і ўсходняя мадэль растварэння ў прыродзе (пры адначасовай дыстанцыраванасці ад прыроднай натуральнасці) узаемадзейнічаюць у сінтэтычнай версіі бачання зносін чалавека і прыроднага свету.

Так, з аднаго боку, у беларускай экакультуры, як і ў культурнай традыцыі многіх еўрапейскіх краін, афармляецца парадыгма актыўнага прыродакарыстання. Прынамсі, у паэме Янкі Купалы «Адвечная песня» ў маналогу Жыцця на хрэсьбінах гучыць менавіта гэты пафасны новаеўрапейскі матыў: «Усясільнай рукою тварэння / Даю яму права існення, / На ўласнасць ваду і зямлю, / Душу яму такжа даю. / Пад уладай сваёй будзе меці / Як ёсць усё чыста на свеце / <...> І рэкі, і долы, і горы / Яго будуць слухаць з пакорай... / <…> І будзе цар гэты навек / Названне насіць – чалавек» [1, с. 7–8].

Аднак на самай справе спецыфіку экалагічнай культуры вызначае не факт існавання ці адсутнасці гэтых матываў, а іх аксіялагічны статус у культуры – дамінаванне ці перыферычнасць. Больш за тое, заходні актывізм прыродаўладкавання ў кантэксце беларускай экалагічнай культуры, якая захавала ў сваіх змястоўных падмурках традыцыйныя каштоўнасці антрапапрыроднай гармоніі, набывае зусім іншую афарбоўку: акцэнт робіцца на сугучнасці рытмаў жыцця чалавека і прыродных цыклаў.

Развіццё і пераасэнсаванне гэтага падыходу прыводзіць да таго, што ў беларускай экакультуры складаецца тэндэнцыя да трактоўкі прыроды як фундаментальнага фактару чалавечага існавання. У апавяданні Якуба Коласа «Нёманаў дар» гэтая парадыгма выяўляецца досыць яскрава: Нёман «для сяла быў як родны бацька: і паіў, і карміў, і на сваіх плячах кожнага вынасіў, і кожнага за лета разоў тры ў Коўна і Гродна вазіў, ды яшчэ і на дарогу даваў грошы. <…> Нёман быў нервам сяла, які будзіў яго жыццё і прымушаў чутка прыслухоўвацца да таго, што робіцца навакол. І ўсе важнейшыя справы былі так ці інакай звязаны з Нёманам… Кожны… спад ці прыбыль вады ў ім не праходзілі незаўважнымі для сялян» [2, с. 71].

Чалавечая прыродапераўтваральная дзейнасць, арганізаваная рытмам сельскагаспадарчага цыкла, разумеецца як арганічна ўпісаная ў прыродны працэс: яна не толькі не парушае яго адвечных заканамернасцяў, але і садзейнічае іх ажыццяўленню. «Адна работа за другою / Ідзе-плыве сваёй чаргою / То ў агародзе, то на полі / І не спыняецца ніколі; / І так у клопаце, у рабоце... / Вясна мінецца, прыдзе лета...», – чытаем у паэме Якуба Коласа «Новая зямля» [3, с. 206]. І гэтая знітаванасць чалавека з гаспадарчымі, праз іх з прыроднымі і касмічнымі працэсамі ацэньваецца ў беларускай экалагічнай культуры як максімальная каштоўнасць. «Шчасце раю, / Я шчасця большага не знаю, / Ці знаць яго ўжо не прышлося, / Як толькі тут, на сенакосе...», – знаходзім у тым жа коласаўскім творы [3, с. 211].

Такім чынам, сувязь чалавека з прыродным асяроддзем разумелася ў беларускай экакультуры як больш глыбокая, не абмежаваная толькі асэнсаваннем практычнай залежнасці чалавека ад прыродных з'яў і працэсаў: непарыўная сувязь з зямлёю, якая ўладкоўваецца яго намаганнямі, арганічная ўлітасць у кантэкст прыроднага жыцця і агульныя натуральныя заканамернасці сусвету – усё гэта дае чалавеку ні з чым не параўнальнае пачуццё сапраўднасці быцця, знаходжання свайго месца пад сонцам і выканання свайго наканавання, што з'яўляецца адвечным падмуркам пачуцця ўласнай годнасці. «Вецер абдымае / Стан яе дзявочы, / Сонца ёй цалуе / Шыю, твар і вочы <…> / Смела йдзе у сонца, / Уся сама як сонца, / Гэта жнейка наша / Ў нашаей старонцы», – пацвярджае Янка Купала ў вершы «Жняя» [4, с. 45–46].

У гэтым кантэксце індустрыялізм, урбаністычны кірунак развіцця грамадства ацэньваецца не толькі як негатыўная ў экалагічных адносінах тэндэнцыя («Глядзі! Горы паразрыты, / А чыгункай свет абвіты...» у Францішка Багушэвіча ў вершы «Дурны мужык, як варона» [5, с. 21]), але і значна глыбей – як шлях да страты чалавекам сваёй самастойнасці. Як ацэньвае Максім Багдановіч, гарадскі жыхар, у сваім вершы «Межы», «Заводаў коміны падняў у выш нябёс, / А сам даўно сляпы ад слёз...» [6, с. 275]. Фактычна ўрбаністычнае асяроддзе выступае як зона парушэння касмічных заканамернасцей – такое ўспрыманне горада носьбітам традыцыйнай экалагічнай свядомасці выразна апісана Якубам Коласам у той жа «Новай зямлі»: «Эх, божы люд! Якая сіла / Цябе віхрамі закруціла? / Куды ідзеш, чаго шукаеш? / Які ў сэрцы смутак маеш? <...> / І сам сабе ты чужаніца. / На камяніцы камяніца, / Не згледзець неба край за імі, / І ціснуць сценамі сваімі... » [3, с. 249].

Жыватворны кантакт з прыродай – вось адзінае ратаванне для вырванага з натуральнага кола быцця чалавека індустрыяльнага грамадства. Так, у Цішкі Гартнага: «Цэлы дзень я за брудным сталом / Цэлы дзень скуру цвёрдую скроб, / Стаючы укапаным сталбом, / Я задухай атрутнаю соп. <...> / Навакола чатыры сцяны, / А на іх запляснеўшая столь, / У сабе захавалі яны / Усю крыўду, жаданне і боль. / Вось і вечар... Цяпер я на міг – / На адзін – сваё шчасце знайду, / Кіну-рыну ўсё і ўсіх / Ды у поле я к лесу пайду» [7, с. 36].

Такім чынам, каштоўнасці актывізму прыродаўладкавання, якія ў заходняй культуры абарочваюцца ўстаноўкай на адносіны да прыроды толькі як да крыніцы неабходных для вытворчасці рэчыва і энергіі (парадыгма прыродакарыстання), у кантэксце ж беларускай экалагічнай культуры асэнсоўваюцца ў іншай, больш мяккай, танальнасці: акцэнт робіцца на сугучнасці рытмаў жыцця чалавека і прыродных цыклаў.

Гэтак жа своеасабліва праяўляюцца ў беларускай экалагічнай культуры і ўстаноўкі, што характэрныя для ўсходняга тыпу экасвядомасці, якая грунтуецца на ідэі растварэння чалавечага духу ў касмічнай цэласнасці пры яго абавязковай адасобленасці ад цялесна-прыроднай натуральнасці. Яны набываюць новае гучанне, калі накладваюцца на традыцыйныя каштоўнасці беларускага асэнсавання прыроды: такім чынам беларуская экакультура фарміруе свой ідэал антрапапрыроднай гармоніі, пераасэнсоўваючы і развіваючы на новым падмурку традыцыйную ўстаноўку на ўвасабленне і адухоўліванне прыродных з'яў, да якіх чалавек звяртаецца з нязменным суадчуваннем і спачуваннем («Хмаркі цёмные, мoі братанькі...» у Францішка Багушэвіча) [8, с. 76].

Аднак у беларускай экакультуры не толькі праяўляюцца тыповыя прынцыпы персаніфікацыі стыхій і сіл прыроды, але і развіваецца ідэя глыбіннай сакральнай сувязі паміж станам прыродных працэсаў і станам чалавечай душы: «Эй, ты, Сівер, не дзьмі!.. <...> / Хоць-бы раз без цябе зарунець-бы палям / Устрапянуўся-бы дух у чалавечай грудзі!..» (Янка Лучына) [9, с. 17]. Такім чынам, прырода выступае для беларускага селяніна не толькі ў якасці асяроддзя існавання, але і як непасрэдны выток яго жыццёвых і духоўных сіл.

Але ж значную ролю адыграў у беларускай экакультуры і сустрэчны вектар, які асэнсоўваў жыццё чалавека (як духоўнае, так і эмацыянальнае) як фактар жыцця прыроды. Душэўныя рухі і пачуцці чалавека не застаюцца знешнімі для прыродных праяў, знаходзячы ў жыцці прыроды гучны водгук. Так, менавіта на струнах дравесных стваloў грае сваю песню нядолі скрыпач у паэме Францішка Багушевіча «Смык»: «Каб бярозу раз / Пацягнуў смыком, / Яна вечны час / Раўла б з мужыком!.. » [10, с. 66].

І як для беларускай экакультуры не ўласцівы жорсткі актывізм заходняй традыцыі, гэтак для яе не характэрна і крайнасць усходняй устаноўкі на безасабовае растварэнне ў прыродзе: прызначэнне чалавека асэнсоўваецца не ў катэгорыях знешняга пераўтварэння прыроды і не ў катэгорыях духоўнага дыстанцыравання ад яе натуральнасці, – чалавек успрымаецца беларускай культурай як уладкавальнік таго сусветнага асяродку, у які ён інтэгральна ўключаны неадрыўнай часткай, – у беларускай экакультуры яскрава акрэсліваецца тэма адзінства мікра- і макракосму: «Цёплы вечар, ціхі вецер, свежы стог, / Улажылі спаць мяне вы на зямлі... / Бачу я, з прыродай зліўшыся душой, / Як дрыжаць ад ветру зоркі нада мной, / Чую ў цішы, як расце трава...» ў Максіма Багдановіча [11, с. 62]. Менавіта на гэтым эмацыянальна афарбаваным падмурку – усведамленні непарыўнага адзінства патаемна-экзістэнцыяльнага ў чалавеку і патаемна-сакральнага ў прыродзе – грунтуецца гучная для беларускай экакультуры тэма аховы і захавання жывога. Гэтая традыцыя, атрыбутыўна характэрная для беларускай культуры, была асэнсавана яшчэ ў эпоху Адраджэння: так, у паэме Міколы Гусоўскага «Песня пра зубра», змест якой грунтаваўся на шматграннай гуманістычна-рэнесанснай філасофскай праграме гарманічных узаемадачыненняў чалавека, грамадства і прыроды, адзначаецца даўні парадак – нязменна ахоўваць зямныя багацці: «Княжацкі ўказ пад пагрозай адказнасці строгай / <...> ашчажае <...> багацці лясныя» [12, с. 69].

Для беларускай мастацкай культуры характэрныя творы, якія прасягнуты пантэістычным пафасам і заклікам да чалавечага спачування ад імя шчымліва безабароннай і ўжо параненай чалавекам, знявечанай прыроды: «Плакала бяроза ды гаварыла: / "Ці ж у вас на гэта я заслужыла, / Штоб вы мяне парубалі / І кроў маю пасасалі? / Я вам пры дарозе, як дзяўчо, стаю... / За што ж вы сячэте мяне без віны?"» у Яна Чачота [13, с. 44]. Больш за тое, ад відавочных экафільных матываў беларуская экакультура ўздымаецца да філасофскага асэнсавання праблемы *чалавек – прырода*, фарміруючы фундаментальны светапоглядны ідэал антрапа-сацыя-прыроднай гармоніі, у межах якога каштоўнасці экалагічнага плана найцяснейшым чынам злучаюцца з каштоўнасцямі плана этнанацыянальнага. У гэтым кантэксце асаблівы сэнс набывае тэма *сваёй зямлі*, артыкуляваная ў беларускай экалагічнай культуры як у канкрэтна-асабістым, так і ў агульнанацыянальным планах. Беларуская экалагічная культура захоўвае базавыя традыцыйныя архетыпы бачання адносін чалавека і прыроды, што характэрныя для аграрных культур і знаходзяць сваё праяўленне ў хтанічным гілазаізме. Так, беларускі селянін адчувае сябе сынам зямлі («Дзеткі Маці-Зямлі нашай», – гаворыць аб беларусах Ф. Багушэвіч) [14]; зямля выступае як Маці – стваральніца жыцця, як жыватворная крыніца чалавечага быцця і гарант яго гармоніі з сусветам. Так, у паэме «Новая зямля» Якуба Коласа сустракаем звяртанне да зямлі: «Дзень добры, новая мясціна! / Спаткай мяне, як маці сына <...> / Узброй надзеямі нам грудзі, / Бо мы твае, зямелька, людзі!» [3, с. 47].

Гаспадарча-практычнае авалоданне зямлёю, яе аграрнае уладкаванне пераасэнсоўваецца беларускай экасвядомасцю ў катэгорыях эмацыянальна-асабістага і нават інтымнага: зямля выступае не проста вярхоўнай, але абсалютнай каштоўнасцю. Менавіта аб ёй гаворыць чалавек у самыя патаемныя імгненні свайго жыцця: і сам-насам з каханай жанчынай (Васіль Дзятлік у «Палескай хроніцы» Івана Мележа), і перад смерцю (Міхал у паэме Якуба Коласа «Новая зямля», які кажа: «Зямля... зямля... <...> / Будуй яе» [3, с. 280]; Базыль у Максіма Багдановіча: «Вы прашчайце, прашчайце, шнуры, / Вы прашчайце, негараныя! / Мне вас болі ўжо не гараць...» [15, с. 287].

У беларускай паэзіі распаўсюджаны матыў, што нават жменька роднай зямлі, як святы абярэг, ратуе беларуса на чужой старане: як піша Францішак Багушэвіч, «Умёр бы то мусіць я тут, / Каб не жменька той роднай зямлі…» [16, с. 92]. Увогуле, зямля для беларуса – не проста асяроддзе пражывання, не проста ўмова жыцця, яна – свайго роду субстрат быцця: «Зямля, зямля, / Свой пэўны кут, свая ралля: / То – наймацнейшая аснова / І жыцця першая умова. / Зямля не зменіць і не здрадзіць, / Зямля паможа і дарадзіць, / Зямля дасць волі, дасць і сілы, / Зямля паслужыць да магілы, / Зямля дзяцей сваіх не кіне... » ў Якуба Коласа [3, с. 223].

Такім чынам, беларуская экалагічная культура пераасэнсоўвае захаваную ў яе архетыпах традыцыйную тэндэнцыю сакралізацыі зямлі, якая праяўляецца ў атаясамліванні селянінам сябе з гэтым сакральным пачаткам. Беларуская экалагічная свядомасць мысліць канкрэтнае прыроднае асяроддзе жыцця індывіда ў якасці асаблівай, інтымна значнай для чалавека мікраландшафтнай зоны (менавіта *свая* зямля), якая залежыць у сваёй эвалюцыі ад яго намаганняў – як знешне-практычных, так і ўнутрана-душэўных. Менавіта гэтым глыбінным падмуркам асвячаецца непазбыўнае імкненне селяліна да набыцця сваёй зямлі, якое становіцца аксіялагічнай дамінантай сялянскага менталітэту. «Купіць зямлю, прыдбаць свой кут», – так лапідарна выказвае гэта матывацыйна-светапогляднае credo Якуб Колас [3, с. 64]. Варта ўсвядоміць, што гаворка ў дадзеным выпадку ідзе не толькі і не столькі пра набыццё глебы дзеля пасеваў, колькі пра здабыццё менавіта свайго надзелу як *долі* – ва ўсёй шматсемантычнасці гэтага слова: і як знаходжання свайго месца ў свеце, што дае магчымасць прымаць *удзел* у яго сакральным руху (як *частка*, як яго неадрыўная *доля*), і як шчаслівай (менавіта па прычыне гэтага) *долі*, шчаслівага лёсу.

Змест мастацкіх тэкстаў беларускай культуры сведчыць аб тым, што для яе характэрна каштоўнасная ўстаноўка, якая можа быць абазначана як свайго роду *сіндром Антэя*: расстанне з роднай зямлёй успрымаецца як выпадзенне з суветнай гармоніі, якое па-антэеўску небяспечнае і робіць чалавека безабаронным: «...О, край мой мілы! Усёй душою / Хачу злучыцца я з табою, / У тваіх палях пазычыць сілу...» у Якуба Коласа [3, с. 152]. У найбольш выразнай форме гэта светаподлядная парадыгма праяўляецца ў вершах Максіма Багдановіча: «Паломаны жыццём, чакаючы магілы, / Радзімая зямля, прынікнуў я к табе, / І бодрасць ты ўліла ў слабеючыя жылы, / Зварушыла маёй душы драмаўшай сілы, / І месца ў ёй з тых пор няма ўжо больш жальбе» [17, с. 119].

У беларускай экалагічнай свядомасці непарыўна знітаваныя прыродныя, эстэтычныя, маральныя і рэлігійныя аксіялагічныя структуры. Надзвычай выразным у гэтым сэнсе з’яўляецца сюжэт Францішка Багушэвіча пра тое, як сяляне, якіх гвалтоўна зганялі ва ўніяцкую царкву, аддаюць перавагу не чужому храму, а роднаму лесу, вядучы размову з Богам у пушчы і молячыся дрэвам: «Кожны ў нядзелю раненька ўстане, / <...> І марш у лясы, <...>. / А там, у пушчы, <...> / Чытаюць малітвы...» [16, с. 91].

Беларуская экакультура трактуе прыроду не як абстрактнае асяроддзе, але менавіта як *родную* прыроду, зразумелую ў якасці і Богам дадзенага дабрадатнага дару, і ў якасці спадчыны продкаў, якую, як культуру і мову, належыць захоўваць, бо без яе немагчымая ні асабістая, ні этнічная самаідэнтыфікацыя. Зямля разумеецца ў беларускай экалагічнай свядомасці не толькі як нацыянальны здабытак, але як нацыянальная святыня: «Зямля – аснова ўсёй айчыне» [3, с. 223]. Гэтыя словы Якуба Коласа могуць служыць афарыстычным выказваннем арыентацыі беларускай экакультуры на сінтэз сацыяпрыродных і сацыякультурных каштоўнасцей.

**Заключэнне**

Такім чынам, інтэгральнае ўспрыманне чалавека і яго прыроднага асяроддзя, якое ад пачатку ляжыць у фундаменце беларускай экалагічнай свядомасці, з’яўляецца падмуркам крэатыўнага сінтэзу ў яе прасторы каштоўнасцей заходняй і ўсходняй эка-

лагічных традыцый. У гэтым кантэксце чалавек асэнсоўвае сябе не ў якасці таго, хто стаіць *над* прыродай як яе ўладар і гаспадар (што ўласціва культуры Захаду), і не ў якасці вылучанага з яе носьбіта духу (як гэта характэрна для культуры Усходу), – прычым і ў адным, і ў другім выпадку чалавек апынаецца *па-за* прыродай, – але ў якасці таго, хто, уладкоўваючы прыроду сваім намаганнем, з'яўляецца неад'емнай часткай сусветнага цэлага.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Купала, Я. Адвечная песня / Я. Купала // Зб. тв. : у 7 т. / рэдкал.: В. В. Барысенка [і інш.]. – Мінск, 1972–1976. – Т. 6. – 1975. – С. 7–40.
2. Колас, Я. Нёманаў дар / Я. Колас // Зб. тв. : у 14 т. / рэдкал.: В. Барысенка [і інш.]. – Мінск, 1972–1978. – Т. 4. – 1973. – С. 69–85.
3. Колас, Я. Новая зямля / Я. Колас // Зб. тв. : у 14 т. / рэдкал.: В. Барысенка [і інш.]. – Мінск, 1972–1978. – Т. 6. – 1974. – С. 7–280.
4. Купала, Я. Жняя / Я. Купала // Зб. тв. : у 7 т. / рэдкал.: В. В. Барысенка [і інш.]. – Мінск, 1972–1976. – Т. 3. – 1973. – С. 45–46.
5. Багушэвіч, Ф. К. Дурны мужык, як варона / Ф. К. Багушэвіч // Творы : вершы, паэма, апавяданні, артыкулы, лісты. – Мінск : Маст. літ., 1999. – С. 20–21.
6. Багдановіч, М. А. Мяжы / М. А. Багдановіч // Поўны зб. тв. : у 3 т. / рэдкал.: В. В. Зуёнак [і інш.]. – Мінск, 1992–1995. – Т. 1. – 1992. – С. 274–275.
7. Гартны, Ц. Песні гарбара / Ц. Гартны // Выбр. тв. – Мінск : Кнігазбор, 2012. – С. 35–38.
8. Багушэвіч, Ф. К. Хмаркі / Ф. К. Багушэвіч // Творы : вершы, паэма, апавяданні, артыкулы, лісты. – Мінск : Маст. літ., 1999. – С. 76.
9. Лучына, Я. Сівер / Я. Лучына // Выбр. тв. – Мінск : Маст. літ., 1953. – С. 17.
10. Багушэвіч, Ф. К. Смык / Ф. К. Багушэвіч // Творы : вершы, паэма, апавяданні, артыкулы, лісты. – Мінск : Маст. літ., 1999. – С. 66–67.
11. Багдановіч, М. А. «Цёплы вечар, ціхі вецер, свежы стог…» / М. А. Багдановіч // Поўны зб. тв. : у 3 т. / рэдкал.: В. В. Зуёнак [і інш.]. – Мінск, 1992–1995. – Т. 1. – 1992. – С. 62.
12. Гусоўскі, М. Песня пра зубра / М. Гусоўскі. – Мінск : Маст. літ., 1980. – 192 с.
13. Чачот, Я. «Плакала бяроза ды гаварыла…» / Я. Чачот // Навагрудскі замак : творы. – Мінск : Маст. літ., 1989. – С. 44–45.
14. Багушэвіч, Ф. К. Творы [Электронны рэсурс] / Ф. К. Багушэвіч. – Рэжым доступу: pdf.kamunikat.org/download.php?item=13655-1.pdf. – Дата доступу: 09.03.2019.
15. Багдановіч, М. А. «Як Базыль у паходзе канаў…» / М. А. Багдановіч // Поўны зб. тв. : у 3 т. / рэдкал.: В. В. Зуёнак [і інш.]. – Мінск, 1992–1995. – Т. 1. – 1992. – С. 287.
16. Багушэвіч, Ф. К. Свая зямля / Ф. К. Багушэвіч // Творы : вершы, паэма, апавяданні, артыкулы, лісты. – Мінск : Маст. літ., 1999. – С. 91–93.
17. Багдановіч, М. А. «Калі зваліў дужы Геракл у пыл Антэя…» / М. А. Багдановіч // Поўны зб. тв. : у 3 т. / рэдкал.: В. В. Зуёнак [і інш.]. – Мінск, 1992–1995. – Т. 1. – 1992. – С. 119.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 11.03.2019

***Majeiko M.A.*** **Antey's Syndrome: Environmental Consciousness of Belarusians in the Space of Dialogue of Eastern and Western Cultures**

*The article examines the environmental consciousness of Belarusians as a unique phenomenon of the world ecological culture with the specific features that distinguish it from the environmental consciousness – both in Western and Eastern traditions.*